# «Пружанскі райаграсэрвіс»: скачок з 13-га месца — на 7!   (http://www.budni.by/?p=19363)

*Пятница, 21.10.2016 12:18. Рубрика: Новости.   Просмотров: 160*

**У бягучым годзе значны крок наперад у развіцці малочнай жывёлагадоўлі зрабілі жывёлаводы ААТ «Пружанскі райаграсэрвіс». Па выніках работы за 9 месяцаў па сярэднім надоі малака ад каровы  (3618 кг) таварыства займае сёмае месца ў раёне. Нядрэнна, калі ўлічыць, што мінулы год тут завяршылі перадапошнімі ў зводцы. Прыбаўка да аналагічнага перыяду мінулага года склала 335 кілаграмаў.**



На здымку: начальнік МТК «Шарашова» Г.Л.Мятліцкая і галоўны ветэрынарны ўрач ААТ «Пружанскі райаграсэрвіс» В.У.Ланец.

Сярод тых, хто ўносіць значны ўклад у агульны поспех, МТК «Шарашова» на 1100 галоў, які ўзначальвае Г.Л.Мятліцкая. У гэтыя дні адсюль штодзень класам «экстра» на перапрацоўку адпраўляецца каля 14 тон малака.

Дасягнуць добрых вынікаў немагчыма без надзейнага ветэрынарнага абслугоўвання жывёлы, якой на комплексе налічваецца  2,4 тысячы галоў. З гэтым цудоўна спраўляецца галоўны ветэрынарны ўрач гаспадаркі В.У.Ланец. У свой час спецыяліст закончыла з адзнакай Ляхавіцкі аграрны каледж, а хутка атрымае дыплом аб заканчэнні Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.



Спыняцца на дасягнутым жывёлаводы МТК «Шарашова» не збіраюцца. Па словах начальніка, яшчэ ёсць рэзервы для росту.

Мікола АРХУЦІК